ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕ[СЯ]!

# Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 22 (1209) ● 15 чэрвеня 1978 г. Цана 2 кап.



**Сесія... Самая напружаная і хвалюючая пара студэнцкага жыцця. Кожны імкнецца падрыхтавацца да залікаў і экзаменаў як мага лепш, атрымаць найлепшую адзнаку. Студэнты БДУ добра ўсведамляюць, што іх паспяховая вучоба з'яўляецца укладам у выкананне задач, пастаўленых партыяй перад вышэйшай школай.**

**Фота М. Дубовіка.**

## Да 60-годдзя БССР і КПБ

# ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ

У адпаведнасці з рашэннем выканкома раённага Савета народных дэпутатаў № 65 ад 13 красавіка гэтага года ў маі праведзен месячнік абаронных мерапрыемстваў.

Ён прысвечан прадстаячаму 60-годдзю Беларускай ССР і Кампартыі Беларусі. Гэту падзею калектыў універсітэта знамянуе поспехамі ў баявой падрыхтоўцы фарміраванняў грамадзянскай абароны і завяршэннем навучання супрацоўнікаў па праграме ўсеагульнага абавязковага мінімуму ведаў па абароне ад зброі масавага паражэння.

Шмат намаганняў прыклалі ў гэтай справе адказныя арганізатары на факультэтах і кафедрах, а таксама кіраўнікі вучэбных груп па ГА.

Планавыя мерапрыемствы рэктарата і парткома універсітэта выкананы поўнасцю. Падрыхтоўка фарміраванняў грамадзянскай абароны закончана правядзеннем раённых спаборніцтваў, на якіх разведвальная група і група сувязі ГА занялі першыя месцы і ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі, а санітарная дружына упраўлення універсітэта аказалася на пятым месцы сярод дзесяці спаборнічаючых калектываў. Гэты поспех сведчыць аб вялікай стараннасці асабістага саставу нашых каманд і ўменні дзейнічаць у ачагу масавага паражэння зладжана і арганізавана. Падрыхтоўку разведгрупы праводзіў выкладчык В. С. Мяцеліца, сувязістаў — лабарант В. І. Дулінаў і сандружыны—выкладчыкі кафедры ГА І. М. Савацееў, Ф. П. Рэзнікава, Н. П. Оліфер. Неабходна адзначыць вялікі уклад у арганізацыю і правядзенне спаборніцтваў камандзіраў сандружыны В. С. Малашэнкі і камандзіраў звенняў І. М. Спаткай, Л. В. Вылегжанінай, Т. І. Міцюхінай.

**А. СЯДОЎ,**
**начальнік штаба грамадзянскай абароны аб'екта.**

# ПЕРШЫ КАМУНІСТЫЧНЫ

**У год шасцідзесяціgоддзя камсамола будатрадаўцы БДУ выступілі з ініцыятывай стварыць асабівы, камуністычны будаўнічы атрад. Камсамольцы аддадуць даніну павагі подзвігу нашага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, даніну памяці загінуўшым воінам, пабудаваўшы помнік Аляксандру Матросаву ў вёсцы Чарнушкі Пскоўскай вобласці на месцы гібелі героя.**

**Атрад, які ўзначальвае сакратар камітэта камсамола мехмата Аляксандр Казулін, сфарміраваны на базе механіка-матэматычнага факультэта БДУ. Але акрамя матэматыкаў у яго састаў уваходзяць яшчэ і юрысты.**

**— Вельмі добрыя, цікавыя рабяты ўвайшлі ў атрад, — расказвае камандзір. — Большасць з іх не ўпершыню ў СБА. Па два будаўнічыя сезоны за плячыма Юрыя Пазняка і Сяргея Чыжыка, якія прыйшлі да нас з СБА «Волаты». У чацвёрты раз паедзе на будоўлю чацвёртакурсніца Галя Гульковіч— незамяніым баец СБА, спецыяліст на ўсе рукі.**

**На месцы дыслакацыі ў камуністычны СБА імя А. Матросава ўвойдуць 12 байцоў-пскавічан разам з камісарам.**

**Рабяты спадзяюцца, што атрад падружыць, сцэментуе сумесная работа, сімвалічная і ганаровая.**

**Т. САХАШЧЫК.**

# ПАСТАНОВА

**БЮРО КАМІТЭТА КАМСАМОЛА БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА «АБ УДЗЕЛЕ КАМСАМОЛЬСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ УНІВЕРСІТЭТА ВА УСЕСАЮЗНЫМ КАМСАМОЛЬСКА-МАЛАДЗЁЖНЫМ СУБОТНІКУ, ПРЫСВЕЧАНЫМ XI СУСВЕТНАМУ ФЕСТЫВАЛЮ МОЛАДЗІ І СТУДЭНТАЎ У ГАВАНЕ».**

У выкананне пастановы ЦК ВЛКСМ «Аб правядзенні Усесаюзнага камсамольска-маладзёжнага суботніка 24 чэрвеня 1978 года», з мэтай удасканалення норм і метадаў патрыятычнага, інтэрнацыянальнага і працоўнага выхавання студэнцкай моладзі, павышэння яе ролі ў выкананні народнагаспадарчых планаў бюро камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна

ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Камітэтам камсамола факультэтаў, падраздзяленняў універсітэта, бюро камсамольскіх арганізацый забяспечыць актыўны ўдзел камсамольцаў, усіх студэнтаў, маладых выкладчыкаў і супрацоўнікаў ва Усесаюзным камсамольска-маладзёжным суботніку. Выкарыстоўваючы ўсе сродкі і формы прапагандысцкай работы, давесці да свядомасці членаў ВЛКСМ, усіх студэнтаў мэты і задачы суботніка.

2. Для падрыхтоўкі і правядзення суботніка ва ўсіх арганізацыях стварыць штабы. Агульнауніверсітэцкі штаб зацвердзіць у саставе тт. Тозіка А. (старшыня), Калінкі А. (намеснік старшыні), Прыгодзіча М., Няхайчыка М., Данекіна А., Саўчанкі В.

3. Улічваючы, што ўся камсамольская арганізацыя універсітэта не можа прыняць удзел у суботніку 24 чэрвеня, лічыць мэтазгодным:

а) камсамольскім арганізацыям супрацоўнікаў і падрыхтоўчага аддзялення прыняць удзел у суботніку на працягу другой паловы чэрвеня;

б) байцам зводнага студэнцкага будаўнічага атрада БДУ правесці суботнік у фонд XI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў 20 ліпеня 1978 года;

в) усім астатнім членам ВЛКСМ прыняць удзел у суботніку на працягу ліпеня месяца г. г., тым, хто знаходзіцца на практыцы, прыняць удзел у суботніку, абапіраючыся на дапамогу камсамольскіх арганізацый базавых прадпрыемстваў.

4. План пераліку сродкаў, заробленых на суботніку, для камсамольскіх арганізацый факультэтаў і падраздзяленняў устанавіць зыходзячы з разліку 1,5 рубля на кожнага члена ВЛКСМ.

5. Сродкі, заробленыя ў выніку правядзення суботніка, пералічваюцца на ўноў адкрываемы ва ўсіх установах Дзяржбанка СССР асобны субрахунак згодна з парадкам, які ўстаноўлен пісьмом Мінфіна СССР, Дзяржплана СССР, Дзяржбанка СССР і ЦСУ ад 20 сакавіка 1974 года № 68.

6. Персанальную адказнасць за падрыхтоўку, правядзенне суботніка і пералік заробленых на суботніку сродкаў ускласці на сакратароў камсамольскіх арганізацый.

7. Сакратарам камсамольскіх арганізацый факультэтаў і падраздзяленняў інфармаваць камітэт камсамола БДУ аб гатоўнасці да суботніка да 20 чэрвеня 1978 года; справаздачы аб удзеле ў суботніку прадставіць 24 чэрвеня да 16.00, 1 ліпеня да 15.00 і 1 верасня справаздачы аб пераліку сродкаў.

8. Кантроль за выкананнем пастановы ўскласці на штаб працоўных спраў камітэта камсамола БДУ.

**У студэнтаў II курса фізічнага факультэта—адзін з адказных экзаменаў. Яны добра падрыхтаваліся. Кандыдат філасофскіх навук Н. К. Кісель задаволена адказам Валодзі Панковіча.**

**Фота М. Дубовіка.**



Куратар і група

# ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ПОЧЫРК ЖЫЦЦЯ

**Інтэрв'ю нумара**

Гэта стала ўжо традыцыяй — у добрай дружнай групе і пасняховасць заўсёды добрая, і вольны час творча выкарыстоўваецца ўсімі студэнтамі. Што такое студэнцкая акадэмічная група? Гэта перш за ўсё калектыў са сваімі інтарэсамі, складанымі ўзаемаадносінамі, радасцямі і засмучэннямі, са сваім індывідуальным почыркам жыцця. Як жа зрабіць так, каб гэты почырк быў почыркам цікавага і змястоўнага жыцця? Як дабіцца таго, каб жыццё ў гэтым маленькім студэнцкім калектыве было шчаслівым? Якая роля ў стварэнні клімату групы належыць куратару?

Давайце пазнаёмімся з адным з іх. Гэта выкладчык гістарычнага факультэта Вольга Іванаўна Ханкевіч. Мы папрасілі яе адказаць на пытанні, кола якіх можна акрэсліць двума словамі: куратар—група.



У Тані Жарко, студэнткі І курса вячэрняга аддзялення мехмата, па-сапраўднаму добры настрой. Вынікі вучобы і праца ў вылічальным цэнтры БДУ прыносяць ёй задавальненне.

Фота А. Русаковіча.

**— Вольга Іванаўна, якой бывае першая сустрэча з групай, яе роля ў далейшай рабоце?**

— Перад першай сустрэчай з маёй будучай групай (а іх было ўжо тры) я заўсёды хвалююся: як прымуць мяне студэнты, ці будзем мы разумець адзін аднаго? Бадай, ад першай сустрэчы, ад уражання, якое ты зробіш на студэнтаў, у многім залежаць далейшыя ўзаемаадносіны з групай.

Спачатку дапамагаю сваім студэнтам добра вырашыць жыллёвую праблему. Часам даводзіцца адшукваць для каго-небудзь кватэру, некаму дапамагчы ўладкавацца ў інтэрнат. Гэта, на мой погляд, павінна ўваходзіць у кола абавязкаў кожнага куратара.

**— Якая роля, на Ваш погляд, належыць камсамольскім сходам і ці ўдзельнічаеце Вы ў іх?**

— Ролю камсамольскага сходу групы цяжка пераацаніць. Неаднаразова я заўважала, што нават самыя непаслухмяныя рабяты падначальваюцца той дзелавой атмасферы, якая пануе на гэтых сходах. Крытыка, тым больш калі яна аднадушная, дзейнічае тут безадмоўна. Адстаючы ў вучобе або прапускаючы заняткі студэнт, як правіла, паляпшае свае паводзіны пасля сходу. Што датычыцца ролі куратара на камсамольскім сходзе, то трэба сказаць, што я заўсёды прадастаўляю права рашаць усе канфлікты самім студэнтам. Няхай спрачаюцца, адстайваюць сваю думку, даказваюць...

**— Скажыце, калі ласка, як вырашаецца праблема: вольны час — куратар?**

— Хачу, каб мае студэнты развіваліся ўсебакова. Не толькі добра вучыліся, але і займаліся спортам, цікавіліся мастацтвам. Складаючы план работы на семестр, мы стараемся зрабіць яго такім, каб мерапрыемствы, намечаныя намі, былі цікавыя для ўсіх. Я раю рабятам наведаць той або іншы музей, тэатр, выстаўку. Шмат тут залежыць ад саміх студэнтаў. Калі ў калектыве абыякавыя, пасіўныя, інертныя людзі, то іх вельмі цяжка чымсьці зацікавіць. У мяне бывалі такія выпадкі. Я спрабавала зрабіць усё, але вынікі былі дрэнныя. Радуе мяне ў гэтых адносінах мая цяперашняя група (1-я група І курса). Рабяты ў ёй вельмі цікаўныя.

**— Дык хто ж такі куратар?**

— На мой погляд, — старшы і больш вопытны калега па сумеснай рабоце, у паспяховых выніках якой зацікаўлены абодва бакі.

**— Вольга Іванаўна, якія рысы характару Вы лічыце галоўнымі для куратара?**

— Добразычлівасць, уменне ставіць сябе на месца іншага (студэнта, асабліва ў крытычным становішчы).

**— Якімі б Вы хацелі бачыць сваіх памочнікаў (камсорга, праформа, старасту)?**

— Ініцыятыўнымі, жыццярадаснымі, незалежнымі ў сваіх ацэнках, справядлівымі.

**— Якой, на Ваш погляд, павінна быць ідэальная група? Ці ёсць такія?**

— Ідэальная група павінна ацэньвацца адным крытэрыем: поўнае ўзаемаразуменне паміж членамі групы. Ці ёсць такія? Гэта ўжо складаней. У кожнага члена групы ёсць свае сімпатыі і антыпатыі, у кожнага свой характар, адсюль і разыходжанні ў думках, і спрэчкі, і нават канфлікты. Без гэтага нельга абысціся. А можа і не трэба, каб былі ідэальныя групы, дзе ўсё было б гладка?

**— Як адбываецца фарміраванне клімату групы, якая сіла ўздзеяння куратарскага слова?**

— Фарміраванне клімату групы — працэс доўгі. Як правіла, гэты клімат залежыць ад суадносін сіл у групе: калі ў тройку (камсорг-прафорг-староста) уваходзяць ініцыятыўныя, хварэючыя за справы групы людзі, якія пастаяць не толькі за сябе, але і за сваіх таварышаў, то беспамылкова можна гаварыць аб здаровых узаемаадносінах у групе.

Куратарскае слова... Яно дае жадаемыя вынікі і будзе мець сваю сілу ў рашэнні тых або іншых пытанняў, але гэта пры ўмове, што куратар карыстаецца ў групе павагай і аўтарытэтам.

**— І апошняе пытанне, Вольга Іванаўна. Работа куратара ў час сесіі?**

— Напэўна, кожны куратар перажывае ўсе ўдачы і няўдачы сваіх студэнтаў у час сесіі. Я заўсёды ў такі гарачы час стараюся дапамагчы ім практычнай парадай, даць кансультацыю. Часам трэба проста падтрымаць чалавека, даць яму адчуць, што яго лёс не абыякавы нам. Такі ўдзел заўсёды прыносіць вялікую карысць.

**Інтэрв'ю правяла В. ШАЛІЎСКАЯ.**

---

ПОДЫХ ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА

# ДОБРЫЯ СПРАВЫ

«Аб'ектам юбілейнага года — студэнцкі знак якасці!» Пад такім дэвізам будзе працаваць сёлета студэнцкі будаўнічы атрад імя Курчатава (факультэт радыёфізікі і электронікі) на адной з ударных камсамольскіх будоўляў Мінскай вобласці — узвядзенні бройлернай фабрыкі ў г. п. Фаніпаль. Атрад намеціў асвоіць 78 тысяч рублёў капіталаўкладанняў.

Узрост будатрада параўнаўча малады, але біяграфія ў яго багатая працоўнымі справамі. За 3 гады існавання атрад не толькі ўзмужнеў, загартаваўся, а ператварыўся ў адно цэлае — дружны калектыў. Праца на будоўлях Пскоўскай вобласці, далёкай Карэліі — гэта пачатак біяграфіі. Працяг курчатаўцы зрабілі ў мінулым годзе. Яны падтрымалі ініцыятыву ствараць будатрады на час зімовых канікул і ўвесь гэты тэрмін працавалі ў Мінску на будаўніцтве жылых дамоў у раёне Зялёнага Луга. Тут хлопцы пацвердзілі, што яны— сапраўды працаздольны і руплівы атрад.

Байцы атрада правялі ўжо 6 суботнікаў. Яны працавалі на добраўпарадкаванні свайго інтэрната, на будаўніцтве універсітэцкага гарадка ў Шчамысліцах. Атрадаўцамі прачытана шмат лекцый у розных навучальных установах горада, будаўнічых арганізацыях і на прадпрыемствах. Шматграннае і цікавае жыццё курчатаўцаў рэгулярна адлюстроўваецца на старонках насценнага друку. Толькі ў падрыхтоўчы перыяд выпушчана 5 нумароў насценгазеты «Плячом да пляча»—органа камсамольскай арганізацыі будатрада.

Нядаўна курчатаўцы ўзялі шэфства над піянерскім лагерам «Дружны». Камандзір атрада М. Гладко і баец У. Кобель абсталявалі тут радыёвузел. Намячаецца правядзенне тэматычных вечароў і лекцый.

Зараз ва ўсіх студэнтаў адказная пара — сесія. Студэнцкі будаўнічы атрад імя Курчатава паставіў баявую задачу — здаць экзамены толькі на «выдатна» і «добра». А слова ў атрадзе трымаць умеюць.

**В. ЧАРНУШЭНКА,**
**баец СБА імя Курчатава.**

---

Камсамольскае жыццё

ВЫКЛЮЧНА важнай падзеяй у жыцці кожнага камсамольца, усіх юнакоў і дзяўчат нашай краіны стаў XVIII з'езд ВЛКСМ, які з новай сілай прадэманстраваў маналітную згуртаванасць Ленінскага камсамола вакол Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, гатоўнасць маладога пакалення заўсёды і ва ўсім кіравацца запаветамі вялікага Леніна, быць вернымі справе Кастрычніка, памнажаць славу і магутнасць любімай Радзімы.

Камсамольцы, уся савецкая моладзь з вялікім натхненнем успрынялі прывітанне Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза XVIII з'езду ВЛКСМ, яркую, глыбокую, заклікаючую на новыя здзяйсненні прамову таварыша Л. І. Брэжнева, якая стала для Ленінскага камсамола баявой праграмай дзейнасці.

Па рашэнню бюро ЦК ВЛКСМ у маі — чэрвені ва ўсіх камсамольскіх арганізацыях прамысловых прадпрыемстваў і будоўляў, калгасаў і саўгасаў, навучальных устаноў, воінскіх часцей і падраздзяленняў пройдзе Ленінскі ўрок «Заўсёды з партыяй, заўсёды з народам!»

Задача Ленінскага ўрока заключаецца ў тым, каб мабілізаваць усіх камсамольцаў, усю савецкую моладзь на безумоўнае ажыццяўленне задач, якія пастаўлены ў прывітанні Цэнтральнага Камітэта КПСС, прамове Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыша Л. І. Брэжнева на XVIII з'ездзе ВЛКСМ.

На Ленінскім уроку камсамольцы, юнакі і дзяўчаты зноў звернуцца да прац Л. І. Брэжнева, яго кніг «Малая зямля» і «Адраджэнне», яшчэ і яшчэ раз сканцэнтруюць увагу на надзённых задачах камуністычнага будаўніцтва, прааналізуюць недахопы, якія яшчэ ёсць, намецяць новыя рубяжы свайго ўдзелу ў стваральнай рабоце партыі, усяго савецкага народа.

Прыблізны план Ленінскага ўрока «Заўсёды з партыяй, заўсёды з народам!» прадугледжвае вывучэнне і разгляд наступных пытанняў:

**Прывітанне ЦК КПСС XVIII з'езду ВЛКСМ, прамова Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыша Л. І. Брэжнева — баявая праграма дзейнасці Ленінскага камсамола, кожнага камсамольца.**

## «ЗАЎСЁДЫ З ПАРТЫЯЙ, ЗАЎСЁДЫ З НАРОДАМ!»

Прамова таварыша Л. І. Брэжнева на XVIII з'ездзе ВЛКСМ — выдатны дакумент творчага марксізму-ленінізму, выключная маштабнасць і актуальнасць яго палажэнняў і вывадаў.

Безраздзельнае, гарачае і аднадушнае адабрэнне і падтрымка камсамолам і савецкай моладдзю ленінскай палітыкі роднай Камуністычнай партыі, дзейнасці ЦК КПСС, Палітбюро ЦК на чале з выдатным партыйным і дзяржаўным дзеячам таварышам Л. І. Брэжневым.

Бацькоўскае слова партыі, задачы, пастаўленыя таварышам Л. І. Брэжневым, — шырокая перспектыва дзейнасці Ленінскага камсамола, актыўная сіла, мабілізуючая маладое пакаленне на новыя здзяйсненні ў імя Радзімы, у імя перамогі камунізму.

**Камсамольцы — маладыя ленінцы павінны быць актыўнымі палітычнымі байцамі, якія здольны на справе праводзіць палітыку партыі, весці непрымірымую барацьбу з варожай ідэалогіяй.**

Марксісцка-ленінскае вучэнне аб законах развіцця грамадства — галоўны компас на шляху да камунізму.

Выхоўваць юных грамадзян вернымі сынамі і дочкамі Савецкай Айчыны, стойкімі барацьбітамі за справу камунізму.

Вялікі подзвіг савецкага народа ў гады вайны і аднаўлення народнай гаспадаркі, здзейснены пад кіраўніцтвам Ленінскай партыі. Кнігі таварыша Л. І. Брэжнева «Малая зямля» і «Адраджэнне» — выток фарміравання ў савецкай моладзі адданасці справе Камуністычнай партыі, сацыялістычнай Радзіме, глыбокага патрыятызму і інтэрнацыяналізму, высокіх ідэйна-маральных якасцей.

Развіваць і памнажаць слаўныя традыцыі партыі і народа —доўг кожнага камсамольца, усіх юнакоў і дзяўчат.

Усталяванне норм і прынцыпаў камуністычнай маралі— важная задача камсамола.

**Курс партыі на эфектыўнасць і якасць — вызначаючы фактар эканамічнага і сацыяльнага развіцця краіны, праграма выхавання моладзі.**

Актыўны ўдзел маладых працаўнікоў у барацьбе за эфектыўнасць і якасць, ажыццяўленне гістарычных рашэнняў XXV з'езда КПСС, паспяховае выкананне заданняў дзесятай пяцігодкі. Далейшае развіццё і дасканаленне руху «Пяцігодцы эфектыўнасці і якасці — энтузіязм і творчасць маладых!»

Навучыцца па-дзелавому ўкараняць перадавы вопыт, даводзіць да канца ўсякую карысную справу.

Дзейнасць камсамольскіх арганізацый па актыўнаму ўдзелу ў рашэнні задач капітальнага будаўніцтва, транспарту, сельскай гаспадаркі, сферы гандлю і абслугоўвання.

Павышэнне ролі «Камсамольскага пражэктара» ў барацьбе за эканомію і беражлівасць, умацаванне працоўнай, тэхналагічнай дысцыпліны, стварэнне ў калектывах абстаноўкі нецярпімасці да праяў безгаспадарчасці.

**Роля КПСС і Савецкай дзяржавы ў захаванні і ўмацаванні міру, у барацьбе за шчасце свабоднай працы на мірнай планеце.**

Паслядоўнае здзяйсненне Праграмы далейшай барацьбы за мір і міжнароднае супрацоўніцтва, за свабоду і незалежнасць народаў, прынятай XXV з'ездам КПСС.

Шматгранная, тытанічная дзейнасць Генеральнага сакратара ЦК КПСС. Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыша Л. І. Брэжнева па ўмацаванню трывалага міру на зямлі.

Удзел ВЛКСМ у рэалізацыі знешнепалітычнага курса КПСС, у замацаванні міжнароднага дэмакратычнага руху. XI Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў на Кубе.

(«Комсомольская правда»).

Добра праходзіць Ленінскі ўрок у камсамольскай арганізацыі нашага універсітэта. Юнакі і дзяўчаты падрыхтоўчага факультэта, супрацоўнікі факультэтаў і кафедр, розных падраздзяленняў актыўна ўключыліся ў вывучэнне і прапаганду рашэнняў XVIII з'езда ВЛКСМ, прывітання ЦК КПСС XVIII з'езду камсамола, прамовы Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыша Л. І. Брэжнева, яго кніг «Малая зямля» і «Адраджэнне».

# Перад спартыўным сезонам

Ужо амаль тыдзень ранішняе сонца будзіць нас у Ялце, у горадзе мора, гор і цяпла. Мы —гэта зборная каманда універсітэта па лёгкай атлетыцы. Семнаццаць юнакоў і дзяўчат, адданых спорту, прыехалі сюды на трэніроўкі, каб увайсці ў спартыўную форму перад адказнымі стартамі сезону.

Мы заўсёды разам: і на трэніроўках, і ў час адпачынку. Часам нашым стадыёнам рабіліся цяністыя алеі Масандраўскага парку альбо бераг мора.

Ялта не толькі курортны горад. Гэта і вялікі спартыўны цэнтр. Усіх жадаючых займацца спортам запрашаюць да сябе стадыёны, утульныя спортбазы. Можа таму так часта сустракаеш на вуліцах горада моладзь у спартыўных касцюмах з трыма палоскамі — будучых удзельнікаў Алімпіяды-80. І хто ведае, можа з гэтых юнакоў і дзяўчат атрымаюцца ў будучым новыя Барзовы і Брумелі, Чыжовы і Санеевы.

...Мы ідзем па старых, вузкіх вуліцах Ялты. Многія з нас упершыню тут. І таму кожная дробязь цікавіць, захапляе, надоўга захоўваецца ў памяці.

— Ёсць прапанова паехаць у горад-герой Севастопаль, — звяртаецца да ўсіх Сяргей Вярсан. Ён вучыцца на гістфаку і таму проста не можа жыць без вандраванняў. Але праз некалькі хвілін хтосьці прапануе пайсці з раніцы да мясцовай гары Ай-Петры, хтосьці агітуе зрабіць марскую прагулку да Паляны казак. Хочацца як мага больш убачыць.

— Такія спартыўныя зборы мы праводзім кожны год. Гэта стала ўжо традыцыяй, — расказвае старшы трэнер В. Я. Шпігаў. — Ёсць, безумоўна, свае цяжкасці, праблемы, але галоўнае тое, што спартсмены атрымаюць тут зарад бадзёрасці, увойдуць у лепшую спартыўную форму. Гэта і ёсць асноўная мэта збораў.

С. ЛЫСКАВЕЦ.



**На III пленуме Беларускага рэспубліканскага савета СДСТ «Буравеснік» БДУ імя У. І. Леніна быў прызнан пераможцай сацыялістычнага спаборніцтва па развіццю масавай фізкультурнай работы і высокага спартыўнага майстэрства сярод буйнейшых ВНУ краіны і ўзнагароджан пераходным Чырвоным сцягам.**

**НА ЗДЫМКУ: прадстаўнік Цэнтральнага савета студэнцкага спартыўнага таварыства Н. А. Іцура ўручае пераходны Чырвоны сцяг старшыні спартыўнага клуба БДУ В. А. Шапялевічу і загадчыку кафедры фізвыхавання В. Н. Фефелаву.**

# Памяці таварыша



Пасля цяжкай і працяглай хваробы пайшоў з жыцця Пётр Фёдаравіч Пляханаў, выкладчык кафедры марксісцка-ленінскай этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму. Перастала біцца сэрца камуніста, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, чалавека вялікай душы, беззапаветна адданага Радзіме, партыі, справе, якой ён займаўся.

Пётр Фёдаравіч Пляханаў нарадзіўся 15 жніўня 1926 года ў сяле Рэпнае Балашоўскага раёна Саратаўскай вобласці ў сялянскай сям'і. Працоўную дзейнасць пачаў у родным сяле. У 16 год Пётр Фёдаравіч добраахвотнікам пайшоў на фронт. З 17 год ён служыць у органах дзяржбяспекі. На розных пасадах гэтай адказнай работы Пётр Фёдаравіч працуе амаль 18 год. Пасля дэмабілізацыі ён больш 10 год працуе спачатку ў Ленінскім райвыканкоме, а потым у Мінскім гарвыканкоме.

У 1971 годзе Пётр Фёдаравіч пераходзіць на прафсаюзную і выкладчыцкую работу ў Белдзяржуніверсітэт. З 1976 года ён залічваецца на пасаду выкладчыка кафедры марксісцка-ленінскай этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму, работу на якой ён сумяшчае з работай у мясцовым камітэце універсітэта.

Ратная і працоўная дзейнасць Пятра Фёдаравіча адзначана 10 урадавымі ўзнагародамі.

Светлая памяць аб ім як аб прынцыповым камунісце, сумленным працаўніку, чулым і спагадлівым чалавеку, гатовым у любую хвіліну прыйсці на дапамогу людзям, назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах.

**Група таварышаў.**

# Чакаем новых сустрэч з эстрадай



**Нашым студэнтам добра знаёмы вакальна-інструментальны ансамбль філалагічнага факультэта «Універсітэт». Аб яго творчасці знаюць не толькі ў сценах універсітэта, але і за межамі Беларусі. Нядаўна ансамбль стаў лаўрэатам фестывалю «Палітычная песня-78», які праходзіў у красавіку гэтага года ў Ерэване. Наш карэспандэнт сустрэўся з мастацкім кіраўніком ансамбля В. ШУВАГІНЫМ, які падрабязна знаёміць нас з ансамблем філолагаў.**

**— Віталій, перш за ўсё дазвольце павіншаваць ваш ансамбль і вас як кіраўніка з поспехам у Ерэване. Відавочна, шлях да яго быў нялёгкім. Як склаўся ваш ансамбль?**

— Гісторыя стварэння яго даволі простая. Факультэту патрэбен быў свой ансамбль. Купілі апаратуру. Знайшліся жадаючыя іграць. На першых парах свайго існавання наш ансамбль займаўся ў асноўным тым, што абслугоўваў факультэцкія вечары. Да сапраўднай творчасці было яшчэ далёка. Паспрабаваць стварыць нешта сур'ёзнае перашкаджала частая змяняемасць музыкантаў. З 1973 года састаў удзельнікаў ансамбля абнаўляўся тры разы. У той жа час мы, уласна кажучы, «варыліся ў сваім саку». Рэпертуар складаўся ў асноўным з модных сучасных эстрадных песенак. Да таго ж, мы не бачылі перспектывы свайго росту.

**— Гэта звычайныя цяжкасці перыяду станаўлення. А як да вас прыйшоў першы поспех?**

— Вядома, «замкнутасць» у рамках факультэта нас не задавальняла. Трэба к таму ж адзначыць, што з цягам часу мы адмовіліся ад колькаснага росту рэпертуару і вырашылі больш увагі аддаваць яго якасці. Адмовіліся таксама і ад спробы стварыць нешта накшталт «біг-бэнда» і вырашылі абмежавацца біг-бітавым, традыцыйным саставам.

У 1973 г. наш ансамбль заняў першае месца сярод ансамбляў на агульнауніверсітэцкім аглядзе-конкурсе мастацкай самадзейнасці. Гэта наш першы поспех. Потым было запрашэнне ў г. Горкі на Усесаюзны фестываль «Студэнцкія рытмы-76». Дарэчы, гэта быў першы наш выезд за межы Беларусі, першая атэстацыя ансамбля на сталасць. Другое месца, атрыманае намі у Горкім, мы лічым пачаткам нашага станаўлення.

**— Раскажыце крыху аб фестывалі ў Ерэване.**

— Фестываль «Палітычная песня-78» быў вельмі прадстаўнічым. Звыш сарака ансамбляў і асобных выканаўцаў не толькі з СССР, але і іншых сацыялістычных краін прынялі ў ім удзел. Усе яны з'явіліся моцнымі канкурэнтамі іменна з прафесіянальнага пункту гледжання. Журы ўзначальваў Марцін Вартазаран — вядомы армянскі кампазітар і музыкант. Патрабаванні да кожнага выступлення былі вельмі высокія.

**— Як вы ўспрынялі рашэнне журы аб прысуджэнні вашаму ансамблю другога месца?**

— Шчыра кажучы, мы не разлічвалі на такі поспех. У фестывалі ўдзельнічалі вельмі цікавыя калектывы — «Экс» з Чанстахоўскага універсітэта ПНР, «Эры-Буні» і «Меламаны» з Ерэвана, «Гіпербала» і «Вентруге» з Вільнюса. Разам з апошнімі мы падзялілі другое месца. Што датычыць асабіста нас, то мы адрозніваліся ад усіх, бадай, тым, што састаў нашага ансамбля быў самы нешматлікі, і прапанавалі мы на суд гледачоў і журы толькі песні ўласнага сачынення.

**— Цікава пазнаёміцца з вашымі аўтарамі.**

— Мы выканалі на фестывалі ў Ерэване тры песні. Адна з іх, «Жуpавы 39-га года», напісана нашым сябрам, былым выпускніком журфака БДУ Валерыем Пучынскім на словы вядомага беларускага паэта Пімена Панчанкі. Дзве другія — «Мір на Зямлі» і «Калыханка для маленькага чыліица» напісаны членам нашага ансамбля С. Ведмедзем на мае тэксты.

**— Калі ласка, падзяліцеся вашымі творчымі планамі.**

— Мы ўсведамляем тое, што нам, як і любому творчаму калектыву, нельга таптацца на месцы, трэба імкнуцца да бесперапыннага творчага пошуку. Мы ўжо «перахварэлі» музыкай стылю «хардрок» і зараз эксперыментуем у «дзіска» і ў «джаз-року». Больш сур'ёзную ўвагу звяртаем зараз на беларускі народны песенны фальклор, асабліва перыяду XVI—XVII стагоддзяў. Сінтэз старажытнай народнай музыкі і самых сучасных рытмаў уяўляецца нам як вялізная прастора для творчай фантазіі. Спрабуем і будзем у далейшым больш актыўна ўключаць у свае работы элементы традыцыйнага джаза. У сувязі з сучаснымі патрабаваннямі расшырым вакальную групу ансамбля. З хваляваннем чакаем кожнай новай сустрэчы са сцэнай, з эстрадай.

**Інтэрв'ю правёў Ю. ЮРКЕВІЧ, студэнт факультэта журналістыкі.**

**На здымку:** ансамбль філфака ў час канцэрта.

Фота аўтара.

# Пра шкоду курэння

**НОВЫЯ ДАНЫЯ**

Курэнне — адзін з распаўсюджаных відаў бытавой наркаманіі, лячэнне якой вельмі ўскладнена.

Радзіма тытуню — Амерыка. Першымі еўрапейцамі-курыльшчыкамі былі ўдзельнікі экспедыцыі Хрыстафора Калумба (канец XV стагоддзя). У XVI стагоддзі пасол Францыі ў Партугаліі Ж. Ніка першым у Еўропе вырасціў тытунь і заўважыў у ім адурманьваючае рэчыва, якое было названа яго імем—нікацін.

У Расію тытунь трапіў у пачатку XVII стагоддзя, але курэнне яго спачатку сурова каралася, а гандляроў тытунём ссылалі. Аднак колькасць асоб, якія курылі, расла, бо ў часы Пятра І курэнне заахвочвалася. У наш час на планеце налічваюцца сотні мільёнаў курцоў.

Пры курэнні адбываецца сухая перагонка тытуню з утварэннем нікаціну, смол, аміяку, серавадароду, чаднага газу (вокіс вугляроду), воцатавай, мурашынай, сінільнай, масляной кіслот, пірыдыну, а паводле апошніх даных амерыканскіх даследчыкаў Рэдфорда і Ханта з Гарвардскага універсітэта ў арганізм трапляе яшчэ радыёактыўны элемент **палоній,** які вылучае гама-праменні. Пры курэнні 25 працэнтаў усіх названых рэчываў згарае і разбураецца, 50 працэнтаў трапляе ў атмасферу і аказвае ўздзеянне на акружаючых, 5 працэнтаў застаецца ў акурку, а 20 працэнтаў трапляе ў арганізм праз органы дыхання.

Найбольш шкоднымі рэчывамі з'яўляюцца канцэрагенныя смолы, нікацін, аміяк, чадны газ і радыёактыўны элемент палоній.

Яды тытуню асабліва ўплываюць на нервовую сістэму, на сардэчна-сасудзістую сістэму, на стрававальныя залозы і залозы ўнутранай сакрэцыі. Яны трапляюць у арганізм чалавека праз крывяносную сістэму і разносяцца па ўсіх органах і тканях за 21—23 секунды.

Канцэрагенныя смолы і аміяк рэзка раздражняюць слізістыя абалонкі рота, органаў дыхання, носа, гартані, трахеі, бронхаў. Са ста курцоў 95 захворваюць туберкулёзам лёгкіх, а 90 — ракам гартані і лёгкіх.

У здаровага чалавека, які не курыць, сэрца за суткі робіць 100.000 скарачэнняў, а ў тых, хто курыць — 115.000 — 120.000. Значыць, сэрца курца працуе больш напружана, гэта залішняя нагрузка вядзе да заўчаснага зношвання паталагічна зmененай сардэчнай мышцы. Нікацін выклікае спазм сасудаў, павышае артэрыяльны ціск, спрыяе ўзнікненню атэрасклерозу — адкладанню соляў у сценкі сасудаў, паяўленню інфаркту міякарда. Шкодзіць курэнне і органам стрававання. Нікацін зніжае засваенне арганізмам вітаміну «С», спрыяе паяўленню гастрытаў, язвы і робіць таксама шкоднае ўздзеянне на органы пачуццяў (зрок, смак, нюх), зніжаючы іх функцыі. Асабліва згубна дзейнічаюць яды тытуню на арганізм дзяцей і падлеткаў. Школьнік, які курыць, становіцца нервовым і недысцыплінаваным. У курцоў часта наступае заўчасная старасць.

Кожны свядомы чалавек павінен памятаць, што курэнне— гэта добраахвотнае разбурэнне здароўя — свайго і іншых. Не трэба пачынаць курыць. Дарослым варта імкнуцца кінуць курыць зусім — раз і назаўсёды. Кінуць курыць дапамагае змазванне языка і глоткі 0,1-працэнтным растворам азотнакіслага серабра або 5-працэнтным растворам пратарголу.

**А. МАРЫЦ, доктар біялагічных навук, прафесар.**

**Рэдактар А. ДЗЕРАШ.**

НАШ АДРАС **220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.**

АТ 09188 **Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.** Заказ № 919.